УДК 321(476)

Э. Р. Іофе

# Сацыяльна-палітычныя аспекты дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь



*ІОФЕ Эмануіл Рыгоравіч,* доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік і член прэзідыума Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцяў, праваддзейны член Беларускай асацыяцыі палітычных навук. Аўтар звыш 920 друкаваных прац, у т. л. 22 кнігі. Кола навуковых інтарэсаў: палітычная сістэма Беларусі, палітычная культура моладзі, палітычная ўлада, сацыялогія моладзі, правы моладзі, этнасацыялогія, гісторыя навукі і культуры, ваенная гісторыя Беларусі, гістарыяграфія Беларусі і метады гістарычнага даследавання, гісторыя беларускіх яўрэяў.

Палітычная сістэма грамадства дэфінуецца як сістэма палітычных інстытутаў і арганізацый, палітычных ідэй, поглядаў, палітычных, маральных, прававых норм і традыцый і іншых спецыфічных элементаў, з дапамогай якіх здзяйсняецца ўлада або робіцца ўплыў на яе.

Важнейшае месца ў палітычнай сістэме грамадства займае дзяржава. Яна – носьбітка ўладарных паўнамоцтваў і рэалізуе іх у адносінах да насельніцтва, якое пражывае на дадзенай тэрыторыі.

Дзяржава характарызуецца такімі рысамі, якія якасна адрозніваюць яе ад усіх іншых арганізацый палітычнай сістэмы грамадства. Адной з істотных рыс з'яўляецца суверэнітэт.

Суверэнітэт (ням. *souveranitat* ад франц. *souverainete* – вярхоўная ўлада) – вяршэнства дзяржавы, што азначае падпарадкаванне ёй усіх асоб і арганізацый у межах дзяржаўнай тэрыторыі. Дзяржаўная незалежнасць выражаецца ў непадпарадкаванні дадзенай дзяржавы якой-небудзь знешняй уладзе, г. зн. уладзе іншай дзяржавы.

Суверэнітэт бывае знешні і ўнутраны. Гэта азначае, што дзяржава валодае вышэйшай і неабмежаванай уладай унутры краіны, а іншыя дзяржавы абавязаны лічыцца з такім становішчам і паважаць гэты прынцып.

Такім чынам, можна лічыць, што *суверэнітэт* – гэта *сукупнасць правоў народа, якія дазваляюць яму захоўваць незалежнае існаванне, нацыянальную самабытнасць, забяспечваць спрыяльныя ўмовы развіцця з улікам інтарэсаў іншых народаў і сваёй дзяржавы*. Адрозніваюць яго тры аспекты:

1. Суверэнітэт дзяржаўны.
2. Суверэнітэт нацыянальны.
3. Суверэнітэт народны.

Прадметам нашага разгляду з'яўляюцца сацыяльна-палітычныя

аспекты дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, якая з'явілася на палітычнай карце свету 19 верасня 1991 г.

Дзяржаўны суверэнітэт кваліфікуецца як вяршэнства ўрада і фарміруемых ім адміністрацый структур ва ўнутраным жыцці краіны, а ў знешнепалітычных справах – прызнанне сусветным супольніцтвам, іншымі суб'ектамі міжнародных сувязей права дадзенага ўрада на юрыдычна роўных падставах уступаць ва ўзаемаадносіны з іншымі ўрадамі.

Тэарэтычны аналіз сутнасці дзяржаўнага суверэнітэту дазваляе выявіць яго асноўныя рысы.

◈ Суверэнітэт – гэта аб'ектыўная якасная акрэсленасць. Важнымі ўласцівасцямі дзяржаўнай улады выступаюць таксама адзінства ўлады, кіраўнічыя патэнцыі, манаполія праватворчасці, яе аўтарытарнасць з апорай на сілу прымусу і інш.

◈ Набываюць значнасць адносіны і ўзаемадзеянні дзяржаўнай улады з іншымі сацыяльнымі з'явамі (іншая дзяржаўная ўлада, насельніцтва, грамадскія арганізацыі і інш.).

◈ Вяршэнства і незалежнасць дзяржаўнай улады як дзве суверэнныя ўласцівасці ствараюць спецыфічна пэўную супольнасць, якая ахопліваецца паняццем «дзяржаўны суверэнітэт».

◈ Вяршэнства і незалежнасць як важныя ўласцівасці дзяржаўнай улады адначасова з'яўляюцца яе якаснымі прыкметамі.

◈ Асноўныя ўласцівасці дзяржаўнага суверэнітэту – адносіны палітыка-прававыя, а таму само паняцце дзяржаўнага суверэнітэту ёсць паняцце палітыка-прававое.

◈ Устанаўленне заканамерных сувязей паміж сацыяльна-класавымі і палітыка-прававымі бакамі сутнасці дзяржаўнай улады дае магчымасць вызначыць сапраўдны змест дзяржаўнага суверэнітэту.

Суверэнітэт – гэта дынамічны працэс. Важна вызначыць прасторава-часавыя моманты суверэнітэту, якія праходзіць сем стадый.

*Першая* – заява аб намерах. Суверэнітэт недасягальны ці ва ўсякім выпадку не можа быць гарантаваным і стабільным без забеспячэння суверэнітэту народа. Апошні ўключае не толькі карэнных жыхароў, але і ўсё этнічна рознапляменнае насельніцтва дадзенай краіны.

*Другая* – агульнаграмадзянская. Гэта значыць, агульнанацыянальны легітымізм, на аснове чаго – канстытуцыйная легалізацыя курса на дасягненне дзяржаўнага суверэнітэту.

*Трэцяя* – перагаворны працэс. Трэба зразумець раз і назаўсёды: сёння ў свеце інакш справы не робяцца, інакш – гэта мінулае міжнародных, міждзяржаўных, міжнацыянальных адносін.

*Чацвёртая* – пагадненне.

*Пятая* – яго строгае ўзаемакантралюемае выкананне.

*Шостая* – набыццё міжнароднаправавога прызнання дадзенай рэспублікі ў якасці суверэннай дзяржавы.

*Сёмая* – новая інтэграцыя, якая азначае перш за ўсё цесныя эканамічныя сувязі незалежных дзяржаў [1].

У тым, што 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце

Беларусі, ёсць свая гістарычная справядлівасць. Ідэя незалежнасці – дзяржаўнай, палітычнай, нацыянальнай – мае на Беларусі тысячагадовую гісторыю. Яна адлюстравана ў Статутах Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, Статутных граматах Беларускай Народнай Рэспублікі, Канстытуцыях БССР і Рэспублікі Беларусь.

Дэкларацыя ад 27 ліпеня 1990 г. стала трэцім дзяржаўна-прававым актам аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. Яна з'яўляецца якасна новым этапам дзяржаўнага будаўніцтва рэспублікі. Змест Дэкларацыі шматгранны. Ад імя народа парламент Беларусі ўрачыста абвясціў поўны суверэнітэт Беларускай ССР, што азначала «вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады рэспублікі ў знешніх адносінах». У арт. 12 «Дэкларацыі» адзначалася, што «любыя гвалтоўныя дзеянні супраць нацыянальнай дзяржаўнасці Беларускай ССР з боку палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў ці асоб праследуюцца па закону».

Важна ацаніць абставіны, у якіх была прынята «Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР» і пазіцыю большасці насельніцтва Беларусі.

Па-першае, рашаючым штуршком, які ўплываў на ход падзей у Беларусі, быў бурны ход падзей у Расійскай Федэрацыі. З гэтых падзей трэба вылучыць абвяшчэнне незалежнасці Расіі.

Па-другое, неабходна памятаць, што «Дэкларацыя» была прынята мінімальнай большасцю галасоў дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР.

Па-трэцяе, адсутнасць у большасці жыхароў Беларусі пераканання, што абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту рэспублікі і шлях да дасягнення рэальнага суверэнітэту БССР – адзіна правільны шлях. У сувязі з гэтым варта пагадзіцца з меркаваннямі вучонага-гісторыка Я. Мірановіча:

«У Беларусі адсутнічала грамадская перакананасць у тым, што воля народа можа паўплываць на ход палітычных працэсаў. Паўсюдна чакалася такая ўлада, якая забяспечыць справядлівасць і адносны дабрабыт. У грамадскім адчуванні формы ўстанаўлення гэтай улады і метады яе выканання мелі другараднае значэнне.

...Згаданае рашэнне (прыняцце "Дэкларацыі" – *Э. І.*), хаця не вынікала з пераканання і волі большасці дэпутатаў, адкрыла Беларусі шлях да сапраўднай незалежнасці. Аднак суверэнітэтам не была зацікаўлена таксама большасць беларускага грамадства»

У жніўні 1991 г. Вярхоўны Савет БССР надаў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце канстытуцыйны статус, абвясціў аб эканамічнай і палітычнай незалежнасці Беларусі.

У артыкуле 1 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. адзначаецца:

«Рэспубліка Беларусь валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку.

Рэспубліка Беларусь абараняе сваю незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць, канстытуцыйны лад, забяспечвае законнасць і правапарадак» [3].

Сапраўдная дзяржаўнасць і незалежнасць пачынаецца з незалежнай

і моцнай эканоміі. Аб гэтым сведчыць вопыт усіх дзяржаў Еўропы пасля другой сусветнай вайны.

Перад народам Рэспублікі Беларусь пастаўлена цяжкая задача – дасягненне эканамічнай незалежнасці краіны без парушэння яе дзяржаўнага суверэнітэту.

Калі ўнутрыдзяржаўнае нацыянальнае права мае на мэце выражаць і здзяйсняць суверэнітэт у асноўным у межах граніц дзяржавы, то ў знешнедзяржаўнай сферы, у галіне міжнародных адносін міжнародны суверэнітэт рэалізуецца ва ўстанаўленні норм міжнароднага права, а таксама ў дзейнасці міжнародных арганізацый, якія ажыццяўляюць свае функцыі ў адпаведнасці з нормамі міжнароднага права.

Спецыфіка праяўлення і ўвасаблення дзяржаўнага суверэнітэту ў міжнародным праве абумоўлена тымі абставінамі, што міжнародныя адносіны ёсць адносіны суверэнных дзяржаў, і суверэнітэт кожнай дзяржавы тут непазбежна павінен улічваць суверэнітэт іншых дзяржаў і таму з неабходнасцю здзяйсняцца ў форме іх пагадненняў.

На жаль, да цяперашняга часу не створана стройная, навукова абгрунтаваная канцэпцыя знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, вынесенай на суд грамадскасці і заканадаўча замацаванай, як гэта прынята ў многіх краінах. Наўрад ці могуць прэтэндаваць на статус канцэпцыі заява Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб прынцыпах знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь», якая прынята 2 кастрычніка 1991 г., або арт. 18 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Аналіз гэтых дакументаў сведчыць, што іх змест – не больш чым агульныя дэкларацыі са спасылкамі на Статут ААН або на прынцыпы, выкладзеныя ў заключным акце НБСЕ.

У прэамбуле Дэкларацыі Вярхоўнага Савета нашай рэспублікі «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі» адзначаецца, што ён абвяшчае поўны дзяржаўны суверэнітэт рэспублікі, незалежнасць рэспублікі ў знешніх адносінах. У артыкуле 11 гэтага дакумента падкрэсліваецца, што Рэспубліка Беларусь самастойна ажыццяўляе правы на добраахвотныя саюзы з іншымі дзяржавамі і свабодны выхад з гэтых саюзаў.

У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адзначаецца, што Беларусь з'яўляецца суверэннай дзяржавай, якая самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку. Згодна з Асноўным Законам, рэспубліка дзейнічае як паўнапраўны суб'ект міжнародных зносін і сусветнага супольніцтва. Наша краіна пацвердзіла прыхільнасць да прынцыпаў Статута ААН, Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека, міжнародных актаў аб правах чадавека. За кароткачасовы тэрмін – ад жніўня 1991 г. да канца 1992 г. адбылося дыпламатычнае прызнанне Беларусі. На ліпень 2000 г. Рэспубліку Беларусь прызналі 144 дзяржавы, 133 з іх устанавілі з намі дыпламатычныя адносіны [4].

Дэкларацыя «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі» ўпершыню вызначыла знешнепалітычны курс рэспублікі, які вынікае з нацыянальных патрэб і грунтуецца на міжнародна-праваых актах.

У кастрычніку 1991 г. Міністр замежных спраў Беларусі выклаў знешнепалітычныя прынцыпы і прыярытэты Рэспублікі Беларусь:

◈ дасягненне рэальнай незалежнасці;

◈ мабілізацыя міжнароднай падтрымкі ў вырашэнні Чарнобыльскай праблемы;

◈ уключэнне ў агульнаеўрапейскі працэс;

◈ стварэнне ўмоў для фарміравання рыначнай эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь;

◈ забеспячэнне экалагічнай бяспекі;

◈ свабоднае ўзаемадзеянне культур.

З трыбуны ААН было заяўлена, што асновай знешнепалітычнага курсу нашай дзяржавы будуць жыццёвыя інтарэсы беларускага народа.

Нядаўна ў сродках масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь дыскусіравалася пытанне аб тым, які напрамак знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца больш важным – заходні або ўсходні, дакладней Польшча і Заходняя Еўропа, а таксама ЗША або краіны СНД і Балтыі (рэспублікі былога СССР). На наш погляд, сама пастаноўка гэтага пытання малапрадуктыўная. Неабходна кіравацца нацыянальнымі інтарэсамі і галоўнымі задачамі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, а затым ужо разглядаць дапушчальныя шляхі іх дасягнення па тых ці іншых канкрэтных напрамках або сувязях з канкрэтнымі краінамі свету.

Адсутнасць унутрыпалітычнай раўнавагі ў большасці рэспублік былога СССР, якая непарыўна звязана з адсутнасцю дзяржаўных мадэляў, а звычайна – з адсутнасцю новай дзяржаўнай ідэалогіі, аб'ектыўна садзейнічае зацікаўленасці большасці рэспублік у нейкім агульным гаранце іх суверэнітэту, якім магло стаць СНД. Аднак, на думку большасці членаў СНД, гэты гарант не павінен валодаць празмернымі паўнамоцтвамі, здольнымі ўшчаміць незалежнасць удзельнікаў Садружнасці. Узнікае парадокс – агульная структура і пажаданая, і цяжкая адначасова.

Асабліва падкрэслім, што некаторыя з дэклараваных 8 снежня 1991 г. мэт СНД аказаліся вельмі завышанымі, і іх цяжка рэалізаваць у сучасных умовах. Аказалася вельмі складаным і цяжкім гарантаваць і здзейсніць такія мэты, як «вольная празрыстасць граніц», падтрымліваць «агульную ваенна-стратэгічную дактрыну», «каардынаваць знешнепалітычную дзейнасць», «супрацоўніцтва ў фарміраванні і развіцці агульнай эканамічнай прасторы» і г. д

Характарызуючы эканамічную палітыку Беларусі, можна сцвярджаць, што яна зрабіла стаўку на рэінтэграцыю з Расіяй і СНД. З часу ўзнікнення СНД Рэспубліка Беларусь была і застаецца адным з найбольш актыўных прыхільнікаў эканамічных ініцыятыў гэтага аб'яднання. Больш таго, беларускае кіраўніцтва адстойвала неабходнасць стварэння грашовага і таможаннага саюза з былой метраполіяй. За гэтымі намаганнямі знайшлі спробы стварыць яшчэ больш цесны двухбаковы саюз з Расіяй.

Сёння відавочна, што без каардынацыйных органаў, таленавітага і аўтарытэтнага апарату, дакладнага

вызначэння нарматыўнай базы і юрыдычнай сілы рашэнняў саветаў кіраўнікоў краін і ўрадаў, цвёрдай дагаворнай дысцыпліны СНД не зможа функцыянаваць, а тым больш развівацца.

Нацыянальная інтэграцыя патрабуе добраахвотнага самаабмежавання дзяржаўнага суверэнітэту і дэлегавання часткі суверэнных правоў членаў СНД каардынацыйным органам, якія сфарміраваны суб'ектамі аб'яднання. Пакуль галоўнай і адметнай акалічнасцю Садружнасці незалежных дзяржаў з'яўляецца не інтэграцыйнасць, а міждзяржаўнасць. Калі новая сістэма зносін паміж дзяржавамі СНД будзе грунтавацца на ўзаемным даверы, роўнасці, добраахвотным супрацоўніцтве ў цэлым, на прынцыпах ААН і Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (НБСЕ), строгім выкананні норм міжнароднага права ва ўзаемаадносінах суверэнных краін, у будучым з'явіцца магчымасць пераўтварэння СНД у інтэграцыйнае супольніцтва па тыпу ЕЭС.

Сёння многія палітолагі і сацыёлагі аналізуюць праблемы беларуска-расійскага збліжэння і канцэнтруюць увагу на пытанні аб нацыянальнай ідэнтычнасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

На думку дактаранта Паўднёва-Каліфарнійскага універсітэта (ЗША) А. П. Цыганкова, Беларусь можна аднесці да дзяржаў са слабай нацыянальнай ідэнтычнасцю, што і садзейнічала яе ў асноўным прарасійскай палітыцы. «У адрозненне ад Украіны і Прыбалтыкі Беларусь не мела вопыту дзяржаўнасці, пачуццё нацыянальнай ідэнтычнасці ў беларусаў было развіта вельмі слаб Часткова таму Беларусь пасля ўвахо жання ў склад Савецкай імперыі пр дэманстравала самую высоку ступень лаяльнасці Старэйшаму бр ту» [5].

Па заказу групы распр цоўшчыкаў канцэпцыі «Стратэгія дл Беларусі», Лабараторыя «НОВАК» н агульнанацыянальнай рэпрэзент тыўнай выбарцы аб'ёмам 1 608 рэ пандэнтаў у сакавіку 2000 г. правял сацыялагічнае даследаванне «Бел русь і свет». Размеркаванне адказаў н пытанне «Кім, на ваш погля з'яўляюцца беларусы?» паказвае, шт 49.8 % паўналетніх людзей, якія пра жываюць у Рэспубліцы Беларусь, лі чаць, што беларусы з'яўляюцца асоб най самастойнай нацыяй і 42.6 % ад носяць іх да адной з праяў трыадзіна рускай нацыі [6, с. 22]. Гэтыя людзі з'яўляюцца беларускім электаратам.

У сувязі з гэтым кіраўнік дослед чага прыватнага прадпрыемства «НОВАК» А. Вардамацкі адзначае:

«Цяжка пераацаніць важнасц ўзроўню нацыянальнай самасвядо масці грамадзян любой краіны Ступень таго, наколькі інтэнсіўна людзі атаясамліваюць сябе з той нацыяй, прадстаўнікамі якой яны з'яўляюцца, з той краінай, на тэрыторыі якой яны жывуць, – неабходная ўмова суверэнітэту краіны, не менш, чым уласна Канстытуцыя, валюта і дзяржграніца. Менавіта моцная ступень нацыянальнай самаідэнтыфікацыі ляжала ў аснове такога хуткага і рашучага станаўлення ўласнай дзяржаўнасці краін Балтыі. У гэтым заключаецца адно з самых істотных адрозненняў Беларусі ад Літвы, Латвіі

і Эстоніі. Менавіта іншы этна-самаідэнтыфікацыйны фундамент ляжыць і ў аснове таго, што працэсы палітычных і эканамічных рэформ у зазначанай групе краін пайшлі з іншай хуткасцю і ў іншым напрамку» [6, с. 22].

Як жа размеркаваліся адказы на пытанне: «Кім Вы сябе адчуваеце ў першую чаргу?».

«Грамадзянінам Рэспублікі Беларусь» – 75.9 % апытаных, «грамадзянінам Расіі» – 2.2 %, «грамадзянінам СССР» – 12.4 %, «грамадзянінам свету» – 7.4 % апытаных [6, с. 23].

Такім чынам, узровень дзяржаўна-грамадзянскай самаідэнтыфікацыі з'яўляецца большым, чым узровень прызнання этнічнай самастойнасці беларускай нацыі. Але, з другога боку, гэтыя ж 75.9% усіх апытаных адзначаюць, што толькі тры чвэрці пражываючага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь паўналетняга насельніцтва лічаць сябе яе грамадзянамі – гэта, безумоўна, малая лічба, малы ўзровень дзяржаўна-грамадзянскай ідэнтыфікацыі.

8 снежня 1999 г. паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь быў падпісаны Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы і Праграма дзеянняў па яго рэалізацыі. У сувязі з гэтым прэзідэнт нашай краіны А. Р. Лукашэнка адзначыў:

«Беларусь і Расія павінны выпрацаваць такую форму аб'яднання, пры якой абедзве краіны захавалі б свой суверэнітэт і незалежнасць, але пры гэтым існавалі як адзіная дзяржава» [7].

Хоць з кожным днём павялічваецца колькасць краін, прызнаўшых Рэспубліку Беларусь і ўстанавіўшых з ёй дыпламатычныя адносіны, сапраўдны дзяржаўны суверэнітэт дасягаецца не толькі праз юрыдычнае прызнанне. Ён будзе рэальным, калі наша рэспубліка забяспечыць устойлівае развіццё эканомікі, будзе праводзіць самастойную і больш прадуманую знешнюю палітыку, адпавядаючую нацыянальным інтарэсам, павысіць жыццёвы ўзровень свайго насельніцтва, узніме ўзровень абароны правоў і свабод чалавека.

## Літаратура

1. *Федоров Н.* Дорога к суверенитету // Правда. 1991. 21 июля.

2. *Міранові Я.* Навейшая гісторыя Беларусі. Беласток. 1999. С. 217, 219.

3. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года (са зманеннямі і дапаўненнямі). Прынята на рэспубліканокім рэферэндуме 24 лістапада 1996 года. Мн., 1997. Арт. 1.

4. Веды. 2000. № 7 (жнівень). С. 1.

5. *Цыганков А.* Суверенитет в условиях торговой зависимости. Дилеммы экономической безопасности в отношении западных независимых государств и России // Вестник Московского университета. Сер. 18. Социология и политология. 2000. № 2. С. 55.

6. *Вардомацкий А.* Беларусь и мир. Социологическое исследование // Аналитический Бюллетень белорусских фабрик мысли: Спец. вып. № 2(9). 2000. С. 22.

7. Советская Белоруссия. 1999. 18 дек.